# САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫЯ І ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫЯ ПРАЦЭСЫ Ў ЦЭНТРАЛЬНАЙ І ЎСХОДНЯЙ ЕЎРОПЕ Ў КАНЦЫ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

**УДК 929 Радзівілы+94(476) “18”(093.3).**

## ДА ПЫТАННЯ АБ ФАРМІРАВАННІ, ПРАВАВЫМ СТАТУСЕ І СІСТЭМЕ КІРАВАННЯ КОМПЛЕКСУ РАДЗІВІЛАЎСКІХ АРДЫНАЦЫЙ У 1870–1914 гг.

***У. Караленак***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, algerdin1990@gmail.com*

Разгледжаны пытанні гаспадарчых, юрыдычных і адміністрацыйных адметнасцей фарміравання абшару радзівілаўскіх уладанняў ў XIX – пачатку XX стст. Звяртаецца ўвага на прававы статус буйных землеўласнікаў і ардынацый на тэрыторыі Беларусі ў часы Расійскай імперыі. Адзначаецца, што змена доўгатэрміновых асноў гаспадарчага сімбіёзу панскага двара і вёскі, была абумоўлена юрыдычнымі падставамі правядзення аграрнай рэформы і ўвядзення абмежавальнага заканадаўства адносна дзейнасці буйных землеўласнікаў беларускіх губерняў у Расійскай імперыі, самасвядомасць і паходжанне маёнткаў якіх была трывала звязана з эпохай Рэчы Паспалітай.

***Ключавыя словы:*** *Радзівілы; ардынацыя; маярат; сервітут.*

## К ВОПРОСУ О ФОРМИРОВАНИИ, ПРАВОВОМ СТАТУСЕ И СИСТЕМЕ УПРАВЛЕНИЯ КОМПЛЕКСА РАДЗИВИЛЛОВСКИХ ОРДИНАЦИЙ В 1870–1914 гг.

***В. Короленок***

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, algerdin1990@gmail.com*

Рассмотрены вопросы экономических, юридических и административных особенностей формирования совокупности радзивилловских владений в XIX – начале XX вв. Обращается внимание на правовой статус крупных землевладельцев и ординаций на территории Беларуси в эпоху Российской империи. Отмечается, что смена долговременных основ экономического симбиоза помещичьей усадьбы и

деревни была обусловлена правовыми основаниями проведения аграрной реформы и введением ограничительного законодательства в отношении крупных землевладельцев в Российской Империи, самосознание и происхождение имений которых было прочно связано с эпохой Речи Посполитой.

***Ключевые слова:*** *Радзивиллы; ординация; майорат; сервитут.*

## TO THE QUESTION OF FORMATION, LEGAL STATUS AND MANAGEMENT SYSTEM OF THE COMPLEX OF RADZIWILL FEE TAILS IN 1870–1914

***U. Karalenak***

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Ave., 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus, algerdin1990@gmail.com*

This article discusses the issues of economic, legal and administrative features of the formation of the Radziwill possessions in the XIX – early XX centuries. Attention is drawn to the legal status of large landowners and entails on the territory of Belarus in the time of the Russian Empire. It is noted that the change in the long-term foundations of the economic symbiosis of the landlord's estate and the village was due to the legal basis for the agrarian reform and the introduction of restrictive legislation in relation to large landowners in the Russian Empire, whose identity and origin of the estates of which were strongly associated with the era of the Rzeczpospolita.

***Keywords:*** *Padziwills; fee tail; majorat; easement.*

У апошняй трэці XIX – пачатку XX стагоддзя існавалі пяць радзівілаўскіх ардынацый, чатыры з якіх (Нясвіжская, Алыцкая, Клецкая, Давыд-Гарадоцкая) размяшчаліся ў Расійскай імперыі, а Пшыгодзіцкая, фарміраванне якой пачалося ў кан. XVIII ст. з афіцыйным зацвярджэннем ў 1873 г. знаходзілася ў Германскай імперыі.

Часам стварэння трох першых ардынацый князёў Радзівілаў (Нясвіжская, Клецкая, Алыцкая) лічыцца 1586 год, так як дамова братоў Радзівілаў была замацавана каралеўскім подпісам 10 снежня 1586 г. У 1641 годзе была заснавана яшчэ адна ардынацыя – Давыд-Гарадоцкая, якая тым не менш практычна непарыўна была звязана з Клецкай ардынацыяй да 1905 года. Абшар маёнткаў ўсіх ардынацый, акрамя Алыцкай, знаходзіўся ў межах Мінскай губерні і разам з шэрагам алаідальных маёнткаў і сервітутаў быў аб’яднаны ў 1870-я гг. і

пераўтвораны ў вялікі аграпрамысловы комплекс, які ў пач. XX ст. быў падзелены на дзве прыкладна роўныя па тэрыторыі часткі.

З юрыдычнага пункту гледжання радавая ардынацыя з'яўляецца феноменам, бо на працягу доўгага часу знаходзілася ў супярэчнасці не толькі з мясцовым, але і Рымскім правам і мела пэўныя рысы "дзяржавы ў дзяржаве" [4, s. 7]. Часткова прававы статус радзівілаўскіх ардынацый на беларускіх землях мае падабенства з ардынацыяй Замойскіх, якая праіснавала з 1589 па 1939 (як непарыўны комплекс нават да 1944 г.) але нягледзячы на тое, што ў 1870–1914 гг. ардынацыя Замойскіх таксама ўваходзіла ў склад Расійскай імперыі, яна размяшчалася на тэрыторыі Царства Польскага (Прывісленскага краю), заканадаўства якога адрознівалася ад норм губерняў Паўночна-Заходняга краю.

Прававое становішча радзівілаўскіх уладанняў на тэрыторыі Мінскай губерні напярэдадні аб'яднання трох ардынацый было вельмі няпэўным. Паводле забароны 1865 г. набываць "асобам польскага паходжання" землі ў Заходнім краі, Радзівілы гублялі значную частку маёмасных правоў. Пры гэтым, калі гаворка ішла пра нясвіжскую ардынацыю, то статус яе ўладальнікаў братоў Вільгельма і Багуслава Радзівілаў акрэсліваўся як sujets mixtes (палякі-замежнікі). Браты спрабавалі лабіраваць свае інтарэсы ў спрэчных пытаннях, якія ўзнікалі пасля адмены прыгоннага права і ўвядзення абмежавальнага заканадаўства з дапамогай лістоў ад прускага караля, падданымі якога яны з'яўляліся. У сувязі з гэтым, як пісаў у дзённіку тагачасны міністр унутраных спраў Расійскай імперыі П.А. Валуеў іх скаргі разглядаліся на самым вышэйшым узроўні [6, с. 177, 272, 282]. У рэшце рэшт у 1870 г. адмысловае выключэнне ў заканадаўстве для прускіх падданых братоў Вільгельма і Багуслава Радзівілаў было зроблена, а ў 1871 г., пасля смерці Вільгельма Радзівіла, падцверджана для яго сына Антонія Вільгельма Радзівіла [20, с. 49].

Што датычыцца ўладанняў ардыната клецкага і давыд-гарадоцкага Льва Радзівіла, то тагачаснае права забараняла рабіць завяшчанні на карысць родзічаў, якія таксама з'яўляліся асобамі "польскага паходжання (акрамя прамых спадкаемцаў – дзяцей). Такім чынам, бяздзетны (ў шлюбе з С. Урусавай) Леў Радзівіл не мог паводле заканадаўства перадаць камусьці свае маёнткі. Адзінай магчымасцю абыйсці гэта было "Высочайшее усмотрение" і дазвол ад імператара.

Адзначым, што нягледзячы на выкарыстанне тэрміна маярат ва ўнутраным ліставанні, распаўсюджванне закона 1845 г. аб запаведных уладаннях, дзе былі прапісаны нормы маяратнага права на землі ардынацый Радзівілаў не заўсёды распаўсюджваліся, яго магчымае выкарыстанне адносна ардынацый Радзівілаў аспрэчвалася падчас судовых пасяджэнняў у 1870–1914 гг. [22, с. 286–292].

Радзівілаўскія ўладанні ў Рэчы Паспалітай былі аднымі з самых вялікіх на працягу ўсяго XVIII стагоддзя, але ў сувязі са зменай палітычнай сітуацыі ў Цэнтральна-Усходняй Еўропе, грамадзянскімі і ваеннымі канфліктамі і банальным марнатраўствам князёў Радзівілаў у 1814 г. ствараецца Камісія па разбору запазычанасці Радзівілаў (нясвіжскай галіны), якая вылучыла ардынацкія і алаідальныя землі, і прадала значную частку маёнткаў дзеля пагашэння даўгоў крэдытораў [21, с. 94–96]. Падзел на ардынацкія і алаідальныя землі праводзіўся ў сувязі з тым, што адзінай законнай дачкой нясвіжскага і алыцкага ардыната Дамініка Радзівіла была прызнана Стэфанія Радзівіл, шлюб якой з Львом Вітгенштэйнам у 1828 г. зрабіў буйнейшымі землеўласнікамі Беларусі Вітгенштэйнаў, якім у выніку адышлі ўсе радзівілаўскія алаідальныя землі. Больш за тое, у 1829 г. была заключана так званая Познаньская канвенцыя паміж Радзівіламі і Вітгенштэйнамі, якая была перападпісана ў 1834 г. пасля смерці Стэфаніі Радзівіл. Паводле гэтага пагаднення ардынацкія ўладанні Радзівілаў таксама перайшлі ў фактычнае распараджэнне Вітгенштэйнаў і вярнуліся да Радзівілаў толькі ў 1854 г. [7, с. 59–60]. Пасля вяртання, паводле радзівілаўскіх падлікаў, нясвіжская ардынацыя на плане 1859 года налічвала 85737 моргаў [1]. Аднак, трэба адзначыць, што нягледзячы на гэта, практычна ўсе буйныя маёнткі ардынацыі заставаліся ў руках іншых памешчыкаў, з якімі заключаліся доўгатэрміновыя арэндныя дамовы.

Іншы абшар радзівілаўскіх уладанняў у Беларусі (Клецкая і Давыд-Гарадоцкая ардынацыя) быў таксама моцна абцяжараны даўгамі і напачатку 1830-х гг. аспрэчваўся ў судах праз некалькіх спадчыннікаў, якія прэтэндавалі на тытул ардынатаў [16, с. 31–32]. Для вырашэння пытання аб прыналежнасці ардынацый была па Найвышэйшым загадзе прызначаная Камісія, якой было даручана прадставіць адказ на пытанні: 1) з якіх маёнкаў складаецца Клецкая і Давыд-Гарадоцкая

ардынацыі роду князеў Радзівілаў 2) каму яны павінны належаць 3) якая частка з іх можа быць выкарыстана для выплаты даўгоў.

Камісія прыняла рашэнне, што на выплату даўгоў крэдытораў павінны пайсці ўсе алаідальныя землі, а з тэрыторыі клецкай і давыд-гарадоцкай ардынацыі для выплаты даўгоў вылучалася ў арэнднае ўтрыманне чацвёртая частка. Пры гэтым было вызначана, што гэтая чацвёртая частка будзе акрэслена не ад агульнай колькасці зямель, а ад колькасці прыгонных (9476 чал.). Такім чынам, у 1834 г. у складзе Клецкай і Давыд-Гарадоцкай ардынацый засталося 7107 прыгонных, а ардынатам напачатку 1835 г. стаў князь Леў (Леан) Радзівіл. Акрамя гэтага князь здолеў даказаць акт перадачы яму ў 1809 годзе земляў Мальтыйскага ордэна ў Беларусі і ў 1862 г. ён далучыў да сваіх уладанняў маёнткі Стваловічы (суч. Сталовічы) і Пацейкі [12]. Яшчэ адным буйным поспехам Льва Радзівіла стала атрыманне ў 1841 годзе маёнткаў Цімкавічы і Барысаўшчына. Складаныя судовыя працэсы трывалі да 1850 г., калі Сенат паставіў канчатковую кропку ў гэтай справе на карысць Льва Радзівіла [9, с. 163-167]. Аднак, у хуткім часе маёнтак Барысаўшчына, які складаўся з 187520 дзесяцін быў прададзены вялікаму князю Мікалаю Мікалаевічу Раманаву [5, s. 9; 11, с. 362]. Пры гэтым продаж гэтых маёнткаў быў настолькі юрыдычна складаны і неадназначны, што выклікаў вялікі скандал [8, с. 59]. Што датычыцца другога маёнтка Цімкавічы, то ён быў вылучаны паводле ўказа імператара Аляксандра II ад 19 верасня 1861 г. як пажыццёвае ўладанне для жонкі Льва Радзівіла Соф’і Радзівіл з роду Урусавых. Разам з тым, так як шлюб быў бяздзетным, то гэта прымусіла Льва Радзівіла ў рэшце рэшт перадаць клецкую і давыд-гарадоцкую ардынацыі свайму стрыечнаму пляменніку нясвіжскаму ардынату Антонію Вільгельму Радзівілу. Разам з ардынацкімі маёнткамі яму былі перададзены таксама алаідальныя маёмасці: Цімкавічы, Стваловічы і Пацейкі, за што Антоні Вільгельм Радзівіл абавязаўся выплочваць Льву і Соф’і Радзівілам пажыццёвую пенсію [26, с. 227].

Працэс аб’яднання трох радзівілаўскіх ардынацый на тэрыторыі Беларусі (1870–1875 гг.) выпаў на час адмены часоваабавязанага становішча і вылучэння зямлі былым прыгонным сялянам. На тэрыторыі Слуцкага ўезда, дзе размяшчаўся асноўны масіў земляў клецкай і нясвіжскай ардынацый для сялян былі вылучаны ўчасткі зямлі ў ваколіцах населеных пунктаў: Грэснаўшчына (399 дзес.);

Вялікая Быстрыца (>801 дзес.); Кушчыцы (>456 дзес.); Цецераўцы (700 дзесяцін); Красны Стаў (>324 дзес.); Быстрыца (>1110 дзес.); Траянава (>895 дзес.); Бетлеем і Радкава (>374 дзес.); Любкаўшчына, Ганусаўшчына, Дыямпаль (>3583 дзес.); Ферберкава (>315 дзес.); Каралін (>498 дзес.); Салтанаўшчына (>658 дзес.); Перакопаўшчына (>121 дзес.); Куноса (>731 дзес.); Цімкавічы (тры ўчасткі >3477 дзес. >2887 дзес. і >791 дзес.); Волька і Варшаўка (>3392 дзес.); Логвіновічы (>1082 дзес.); Заельня (>272 дзес.); Мервіны (>328 дзес.); Кулікі (>1005 дзес.); Дубейкі (>87 дзес.); Гласкаўшчына (>270 дзес.); Зарэчча (>611 дзес.); Навасёлкі (>644 дзес.); Ліходдзе (>1657 дзес.); Шчэпаўшчына (>517 дзес.); Радзівілмонты (>1357 дзес.); Цэпра, Дзямідовічы, Кушчыца, Цяперка (>1803 дзес.); Грыбоўшчына (>553 дзес.); Касмовічы і Жылічы (>484 дзес.); Борычава (>1019 дзес); Заракава (>156 дзес.); Курляндыя (>411 дзес.); Раёўка і Скепіова (>1894 дзес.), Мілеўскае (>615 дзес.); Горка Малая (>655 дзес.), Сіняўка (>316 дзес.); Малева (>1084 дзес.); Маствіловічы (>1790 дзес.); Ахрымовічы (>493 дзес.), Ануфравічы (>493 дзес.); Грэск (два ўчасткі >2228 дзес. і >1907 дзес.); Клецк (>802 дзес.); Слабодка, Машукі, Маствіловічы, Дзянісавічы (>5419 дзес.); Чудзін (>2400 дзес.) [24]. Акрамя гэтага землі для сялян вылучаліся ў Ігуменскім, Мінскім, Мазырскім, Навагрудскім і Пінскім уездах Мінскай губерні [25].

Пасля адмены прыгоннага права і ўрэгулявання прававых і гаспадарчых адносін з сялянамі комплекс беларускіх ардынацый Радзівілаў працягваў змяншацца ў сувязі з вылучэннем зямлі для чыншавікоў. Праблема вылучэння зямлі для чыншавікоў, якія не хацелі ды і не маглі выплочваць арэндныя плацяжы (у многіх чыншавікоў адсутнічалі плацяжы за 10 і болей гадоў) часта з'яўлялася прычынай цераспалосіцы і двайнога падаткаабкладання для радзівілаўскіх уладанняў. Нізкая эфектыўнасць судовых працэсаў у вырашэнні гэтых спраў і памер выдаткаў на судовыя працэсы з чыншавай шляхтай, які складаў больш за палову ад сумы прэтэнзій схіляў адміністрацыю да вылучэння ім зямлі на льготных умовах [13, с. 265—284]. На тэрыторыі Слуцкага ўезда для чыншавікоў былі вылучаны ўчасткі зямлі ў ваколіцах наступных населеных пунктаў: Куноса (116 дзес.); Вялікія Дубейкі (423 дзес.); Калодезна (340 дзес.); 1-е Руднікі (158 дзес.); Сейлавічы і Ганусаўшчына (960 дзес.); Масевічы (200 дзес.); Бучное (218 дзес.); Затур'я (388 дзес.) і інш. Яшчэ адной катэгорыяй

насельніцтва, для якой вылучаліся землі былі праваслаўныя арэндатары: для іх былі вылучаны землі ў весцы і маёнтку Пацейкі (88 і 9 дзес), в. Раковічы (22 дзес.), в. Салтанаўка (>12 дзес.), Малая Аляксееўка (>11 дзес.) і інш. [24].

Вылучэнне зямлі адбывалася нават падчас Першай Сусветнай Вайны, калі адміністрацыя нясвіжскай ардынацыі вызначыла 1360 дзесяцін (ваколіцы весак Плешэвічы, Качановічы і Пахабаўшчына (суч. Альбянка)) для продажу мясцовай засцянковай шляхце па кошце не менш 57 рублёў за дзесяціну [16, с. 64]. Пры гэтым усяго ў 1914 г. родзічы новага нясвіжска-клецкага ардыната Антонія Альбрэхта Радзівіла, у сувязі са складаным эканамічным становішчам, патрабавалі ад яго зацвердзіць продаж больш за 6 з паловай тысяч дзесяцін ардынацкай зямлі і больш за 3 тысяч дзесяцін з ліку алаідальных земляў.

Вядомы беларускі грамадскі дзеяч Эдвард Вайніловіч, які ў 1903 г. прыняў апеку над маёнткамі Антонія Вільгельма Радзівіла, згадваў ў сваіх успамінах, што ўладанні таго напачатку XX стагоддзя складалі каля 400 тысяч дзесяцін. Паводле ацэнкі Э. Вайніловіча памеры Давыд-Гарадоцкай ардынацыі займалі каля 300 тысяч дзесяцін, а комплекс клецкай і нясвіжскай ардынацый, які застаўся аб'ядданым да 1939 г., складаў каля 135 тысяч дзесяцін [5, s. 90]. Значна больш сціпла ацэньвала агульную зямельную ўласнасць Антонія Вільгельма Радзівіла савецкая даследчыца Л.П. Мінарык, якая на падставе дакументаў кан. XIX – пач. XX ст. склала спіс буйнейшых землеўласнікаў Расійскай імперыі ў 1890–1905 гг. Паводле яе падлікаў князь Антоні Вільгельм Радзівіл валодаў абшарам зямлі плошчай 99304 дзесяцін [14, с. 17]. Сучасныя беларускія даследчыкі арыентаваліся ў ацэнках на спісы землеўладальнікаў Мінскай губерніі 1876 і 1889 гг., якія акрэслівалі ўладанні Антонія Вільгельма Радзівіла ў 150–170 тыс. дзесяцін [11, с. 439]. Пры гэтым аналагічныя спісы за 1911 і 1914 гг. паказваюць наяўнасць прыкладна такога ж абшара землеўладанняў ужо ў кожнага з двух сыноў Антонія Вільгельма Радзівіла, якія падзялілі яго спадчыну [10, с. 693]. Рэзкае павялічэнне землеўладанняў пасля смерці Антонія Вільгельма Радзівіла (паводле гэтых спісаў амаль у два разы) нельга патлумачыць набыццём ва ўласнасць земляў ў ваколіцах вёсак Будча і Чудзін у кан. XIX ст. [15, с. 1 адв.]. Гэтую супярэчлівасць заўважыў В. А. Кахновіч, які даказаў, што афіцыйны ўлік засведчыў значна менш

зямель, чым тое паказваюць матэрыялы ўнутранага радзівілаўскага ўліку на канец XIX ст., якія знаходзяцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі [13, с. 265–284]. Так напачатку XX ст., адміністрацыя князя Антонія Вільгельма Радзівіла згадвала ва ўнутраным уліку пра наяўнасць 218276 дзесяцін лясоў [3, s. 78]. Пры гэтым большая частка лясоў знаходзілася ў межах Давыд-Гарадоцкай ардынацыі.

Паводле архіўных крыніц бачна, што напачатку XX стагоддзя клецкая ардынацыя займала 66049 дзесяцін, а давыд-гарадоцкая – 152026 дзесяцін [18, с. 124–127; 17, с. 3]. Акрамя гэтага ўнутраная дакументацыя пач. XX ст. паведамляе пра 38831.5 дзесяцін лясных сервітутаў, 30779 з якіх адносіліся да Давыд-гарадоцкай, 1039 дзесяцін да Нясвіжскай, а астатнія да Клецкай ардынацыі і алаідальных уладанняў [3, s. 74–77]. Самую невялікую плошчу займала ў гэты час Нясвіжская ардынацыя, для якой была асабліва актуальнай праблема змяншэння агульнай колькасці запаведных земляў праз вылучэнне для сялян, чыншавікоў і праваслаўных арандатараў. Марыя Дарота Радзівіл (на той час удава Антонія Вільгельма Радзівіла) пісала расійскаму імператару Мікалаю II у 1905 г., аб тым што памеры Нясвіжскай ардынацыі зменшыліся на 40 тысяч дзесяцін з-за вылучэння зямлі для розных катэгорый насельніцтва пасля 1861 года. У сувязі з такім рэзкім змяшэннем, княгіня прасіла аб павелічэнні памераў ардынацыі на 36 тыс. дзесяцін за кошт далучэння да ардынацыі маёнткаў Цімкавічы, Стваловічы, Грэск, Пацейкі, Будча і Чудзін [2, с. 126-128]. Гэты падзел на ардынацкія і алаідальныя маёнткі павінен быў ліквідаваць падчас уступлення ў спадчынныя правы ў 1914 г. ардынат Нясвіжскі і Клецкі Антоні Альбрэхт Радзівіл, але паводле карты яго ўладанняў у 1925 г. падзел на ардынацкія і алаідальныя маёнткі ўсё яшчэ захоўваўся.

Такім чынам, зазначым, што паводле прыведзеных лічбаў з архіўных дакументаў Галоўнага архіва старажытных актаў (Варшава) і Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі памер уладанняў Антонія Вільгельма Радзівіла (ардынацкія і алаідальныя землі і сервітуты) складаў больш за 300 тысяч дзесяцін, што, вядома з’яўляецца ўмоўнай ацэнкай з-за вялікай колькасці судовых разбіральніцтваў, якія вяла адміністрацыя комплексу ардынацый Радзівілаў за зямлю. Найбольш складанай для ўрэгулявання з’яўлялася тэрыторыя Давыд-Гарадоцкай ардынацыі. Тут, у 1903 годзе бокам князёў Радзівілаў была атрымана перамога ў спрэчцы з сялянамі сялянскага таварыства вёскі Альшаны,

што дазволіла захаваць 7 тысяч дзесяцін сервітутаў уздоўж ракі Прыпяць, якія самавольна захапілі сяляне [23, с. 367–373]. Разам з тым, у гэтай жа мясцовасці (маёнтак Высокае) ў 1901 годзе суд перадаў 3 тысячы дзесяцін ардынацкай зямлі на карысць памешчыка графа Івана Канкрына [22, с. 286–292]. Вялікая колькасць судовых спраў (у 1887 г. налічвалася каля трохсот) прымушала трымаць асобны юрыдычны аддзел і адвакатаў у сталіцы Расійскай імперыі – Санкт-Пецярбургу, губернскім горадзе Мінску і цэнтрах уездаў Мінскай губерні, дзе размяшчаліся маёнткі. Сярод вядомых адвакатаў, якія працавалі ў радзівілаўскай адміністрацыі неабходна вылучыць Баляслава Альшамоўскага, які ў 1899 годзе зрабіў выданне свайго даследавання па землеўладанні ў Заходнім краі, дзе растлумачыў сутнасць абмежавальнага заканадаўства ў адносінах да памешчыкаў польскага паходжання [20].

Складаны падлік зямельных угоддзяў і супярэчнасці з суседзямі патрабавалі ад адміністрацыі комплексі радзівілаўскіх ардынацый трымаць штат геаметраў на чале з галоўным землямерам І.М. Ждановічам. Зямельнае пытанне была настолькі вострым, што канфлікты здараліся нават падчас працы геаметраў, якія вызначалі межы з латыфундыяй Вітгенштэйнаў (пасля 1887 г. маёнткі княгіні М. Гагенлоэ), нягледзячы на тое, што адносіны паміж адміністрацыямі маёнткаў Радзівілаў і Вітгенштэйнаў былі падкрэслена сяброўскімі [19].

Летам 1865 г. Антоні Вільгельм Радзівіл прыехаў з Берліна разам з дзецьмі і жонкай Марыяй Даротай, якая палічыла Нясвіжскі замак непрыдатным для жыцця. Таму была выкарыстана гасціннасць стрыечнага дзядзькі Антонія Вільгельма князя Льва Радзівіла і сям’я правяла ўвесь час у Радзівілмонтах – тагачасным цэнтры Клецкай ардынацыі. Відаць, што складаныя справы звязаныя з выкупам сялян, зблізілі бяздзетнага Льва Радзівіла з сваім стрыечным пляменнікам, што дазволіла ў рэшце рэшт аб’яднанне ардынацый пад кіраўніцтвам Антонія Вільгельма Радзівіла.

Малады ардынат Антоні Вільгельм Радзівіл, як і папярэдне яго бацька, фактычна не мог удзельнічаць у кіраванні маёнткамі па прычыне сваёй ваеннай службы ў Германскай імперыі, таму падчас аб’яднання ардынацый была прыдумана спецыяльная пасада намесніка ардыната, якую заняў князь Мацей Радзівіл, прадстаўнік так званай Паланечскай галіны роду. Яму, як вопытнаму памешчыку і падданаму

Расійскай імперыі, было значна прасцей займацца шматлікімі гаспадарчымі і судовымі пытаннямі агромністага комплексу ардынацый, які знаходзіўся па-суседству з яго маёнткамі. Неабходна адзначыць, што маёнтак князя Паланечка ў Навагрудзскім уездзе (каля 2 тыс дзесяцін) становіцца ўзорным прыкладам гаспадарчай мадэрнізацыі для маёнткаў комплексу радзівілаўскіх ардынацый.

У 1872 г. А. В. Радзівіл сфарміраваў агульную адміністрацыю для трох радзівілаўскіх ардынацый: нясвіжскай, клецкай і давыд-гарадоцкай, якая павінна была пачаць дзейнічаць з 1 студзеня наступнага года. З 1 студзеня 1873 г. галоўнаўпраўляючым аб’яднаных ардынацый стаў Г. Хемерлінг. Пры яго кароткачасовым кіраванні адміністрацыя маёнткаў кн. А. В. Радзівіла змяняе сваё стаўленне да арэндных дамоў (у сувязі з адменай часоваабавязанага становішча арэнда маёнткаў становіцца нявыгаднай) і пачынае вяртанне маёнткаў з доўгачасовай арэнды. Сярод іншых у 1873 г. на просьбу князя А. В. Радзівіла адмаўляецца ад арэндаванага фальварка Заазер’е (кантракт да 1879 г.) былы галоўнаўпраўляючы нясвіжскай ардынацыі В. Маліноўскі. Аднак Г. Хемерлінг не паспеў адзначыцца сур’ёзнымі дасягненнямі на сваёй пасадзе і ўжо ў хуткім часе комплекс радзівілаўскіх ардынацый узначаліў М. У. Абламовіч, які займаў гэтую пасаду ў 1877–1902 гг. Паводле інфармацыі аб асобах, якія служылі ў Галоўным упраўленні маёнткаў князя Антонія В. Радзівіла і пражывалі ў Нясвіжскім замку і г. Нясвіжы галоўнаўпраўляючы М.У. Абламовіч атрымліваў 4000 рублёў жалавання ў год (на 1886 г.). Паводле сацыяльнага паходжання ён з’яўляўся дробным памешчыкам з вёскі Малыя Жухавічы, якая знаходзілася ў некалькіх кіламетрах ад Паланечкі, а ў маладосці вучыўся ў Імператарскім вучылішчы правазнаўства ў Санкт-Пецярбургу, якое не скончыў з-за дачынення да паўстання 1863–1864 гг. Акрамя М.У. Абламовіча ў адміністрацыі комплекса працаваў яшчэ адзін былы паўстанец – Б. Завадскі.

Падчас аб’яднання ардынацый у 1872 г. было прадугледжана існаванне трох лясніцтваў у Клецкай ардынацыі: Радзівілмонтаўскага, Хамінкаўскага і Грэскага; двух у Нясвіжскай ардынацыі: Нясвіжска-Кулеўскага і Акінчыцка-Сверанькага і аднаго Давід-Гарадоцкага ў Давыд-Гарадоцкай ардынацыі. Праз трыццаць гадоў у комплексе ардынацый А.В. Радзівіла працавалі нясвіжскае, радзівілмонтаўскае, акінчыцкае, хамінкаўскае, грэскае, давыд-гарадоцкае і альманскае

лясніцтвы. Акрамя пералічаных ў апошнія гады ардынацтва А.В. Радзівіла было арганізавана яшчэ адно лясніцтва – Цімкавіцкае, аднак ужо пад кіраўніцтвам новай адміністрацыі, бо ў 1902 г. М.У. Абламовіч сыходзіць з пасады галоўнаўпраўляючага. На яго месца прыходзіць М. С. Свіда (жалаванне 4000 руб.+бонусы), які быў выбраны галоўнаўпраўляючым за паспяховую рэарганізацыю рыбнай гаспадаркі на тэрыторыі Нясвіжскай ардынацыі, якая была закончана ім у 1895 г. і была адзначана залатым медалём на юбілейнай сельскагаспадарчай і саматужна-прамысловай выставе ў Мінску, арганізаванай Мінскім таварыствам сельскай гаспадаркі ў 1901 г.

Калі ў апошняй трэці XIX ст. комплексам ардынацый Радзівілаў апекаваўся князь Мацей Радзівіл, то напачатку XX стагоддзя падобныя функцыі выконваў вядомы беларускі грамадскі дзеяч Эдвард Вайніловіч. У 1903 годзе ён прыняў апеку над маёнткамі Антонія Вільгельма Радзівіла якая працягвалася да канца 1914 г. (пасля смерці Антонія Вільгельма Радзівіла пачаўся працэс падзелу ардынацый, у выніку чаго была вылучана асобная Давыд-Гарадоцкая ардынацыя. Нягледзячы на тое, што юрыдычнае зацвярджэнне працягвалася пяць гадоў пасля смерці ардыната А.В. Радзівіла, эканамічна Давыд-Гарадоцкая ардынацыя ўжо ў 1905 годзе стала асобным зямельным уладаннем і апека Э. Вайніловіча на яе не распаўсюджвалася).

Падсумоўваючы, зазначым, што памер радзівілаўскіх уладанняў у Беларусі (ардынацкія і алаідальныя землі і сервітуты) складаў больш за 300 тысяч дзесяцін, што, вядома з’яўляецца ўмоўнай ацэнкай з-за вялікай колькасці суовых разбіральніцтваў. У другой палове XIX – пач. XX ст. адміністрацыя радзівілаўскіх ардынацый імкнулася пераўтварыць іх у капіталістычны аграпрамысловы комплекс, а асноўнай галіной прыбыткаў бачыўся гандаль лесам. Аднак мадэрнізацыя комплексу радзівілаўскіх ардынацый на тэрыторыі Беларусі адбывалася павольна. Прычынамі гэтага былі застарэлыя даўгавыя абавязацельствы, неўрэгуляваны канфлікт з былымі радзівілаўскімі сялянамі, якія самавольна займалі сервітутныя і іншыя землі і займаліся незаконнай высечкай радзівілаўскіх лясоў, феадальныя перажыткі ў выглядзе надзвычай вялікай колькасці чыншавікоў на землях нясвіжскай ардынацыі, продкі якіх у XVIII ст. складалі радзівілаўскае дамовае войска. Разам з тым нягледзячы на неспрыяльны абмежавальны рэжым Расійскай імперыі, які датычыўся маёнткаў “асоб польскага паходжання”

на тэрыторыі Беларусі, ў радзівілаўскіх ардынацыях з'явіліся лакамабілі і іншая тэхніка, якая працавала ў сельскай і лясной гаспадарцы, укараняліся навейшыя навуковыя дасягненні, якія спрыялі з'яўленню аграпрамысловага комплексу, большасць прадпрыемстваў якога працуюць да сённяшняга часу.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie (AGAD). F. 402. Sygn. 451-3
2. AGAD Dz. XIII Sygn. 97
3. AGAD Dz. XIII t. 3/11
4. Jędrejek, G. Regulacje prawne dotyczące Ordynacji Zamojskiej // Rocznik nauk prawnych. 2012. T. 12. No 3. S. 7–19.
5. Woyniłłowicz, E. Wspomnienia, 1847–1928. Cz. 1. Wilno: nakładem Komitetu Uczczenia ś. p. E. Woyniłłowicza, 1931.
6. Валуев П.А. Дневник министра внутренних дел: Т. 1. М.: Акад. наук СССР, 1961.
7. Гарбачова, В. В. Сістэма кіравання Радзівілаўскай масай у 20–30-я гг. XIX ст. // Acta Anniversaria: зборнік навуковых прац Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка "Нясвіж". 2015. Т. 1. С. 53–65.
8. Герцен А. И. Собрание сочинений. Статьи из "Колокола" и другие произведения 1859–1860 годов. Москва : Наука, 1958.
9. Дело, по разногласію изъ Общаго Собранія 4, 5 и Межеваго Департаментовъ Правительствующаго Сената, о межевыхъ спорахъ казенныхъ Староствъ: Велятицкого, Сморецкого, Гибайловичъ, Пышачи, Эсьмоны и Дзевошицъ, с именіемъ Борисовщизною Князей Радзивилловъ // Россия. Государственный совет. Сборник выс. утв. мнений Государственного совета по гражданским делам. Санкт-Петербург, 1864. С. 163–167.
10. Дрозд, Д. М. Землевладельцы Минской губернии, 1900–1917. Минск: Медисонт, 2013.
11. Дрозд, Д. М. Землевладельцы Минской губернии, 1861–1900. Минск: Медисонт, 2012.
12. Записка по делу князя Льва Радзивилла о неправильном привлечении имений его к ответственности за долги князей Иосифа и Людвига Радзивиллов. Санкт-Петербург: Тип. В. Веллинга, 1876.
13. Кахновіч, В.А. Судовыя цяжбы з удзелам адміністрацыі маёнткаў князёў Радзівілаў як адлюстраванне сацыяльных і палітычных рэалій пачатку XX ст. на Случчыне // Беларусь, Слуцкі край і Эдвард Вайніловіч: мат-лы Міжнар. навук.-практ. канф., г. Слуцк, 22 верасня 2017 г. / Ін-т гісторыі НАН Беларусі; рэдкал.: А.А. Каваленя (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск, 2018. С. 265–284.
14. Минарик, Л.П. Экономическая характеристика крупнейших земельных собственников России конца XIX-начала XX в.: Землевладение, землепользование, система хозяйства. М. : Сов. Россия, 1971.
15. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ) Ф. 694. Воп. 1. Спр. 142.

16. НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 621.
17. НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 1949.
18. НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 3268.
19. НГАБ. Ф. 694. Воп. 4. Спр. 2861.
20. Ольшамовский Б.Г. Права по землевладению в Западном крае. Санкт-Петербург: Ю.А. Мансфельдт, 1899.
21. Попко О.Н. Князья Витгенштейны и их владения в Российской Империи в XIX веке. Мир: Музей «Замковый комплекс «Мир», 2018.
22. Прошение поверенного князя Антона Радзивилла, присяжного поверенного Витвинского, об отмене решения Виленской судебной палаты по иску князя Радзивилла к Руликовским и Глембоцкому, в правах коих вступил, в качестве ответчика, граф Иван Канкрин, о правах собственности на лесную дачу Россия. Сенат. Гражданский кассационный департамент.Решения Гражданскаго кассационнаго департамента Правительствующаго Сената. Петербург : Тип. Правительствующаго Сената, [1868–1916]. 1901. С. 286–292.
23. Прошение поверенных общества крестьян деревни Ольшаны, Евмена Чиникайло и Ивана Лемезы, об отмене решения Виленской судебной палаты по иску князя Антона Радзивилла к означенному обществу об изъятии из владения ответчика земель и о воспрещении ему пастьбы скота на этих землях и ловли рыбы Россия. Сенат. Гражданский кассационный департамент. Решения Гражданскаго кассационнаго департамента Правительствующаго Сената. Петербург: Тип. Правительствующаго Сената, [1868–1916]. 1903. С. 367–373
24. Российский государственный исторический архив (РГИА) Ф. 577. Оп. 50. Д. 2188.
25. РГИА. Ф. 577. Оп. 52. Д. 1265.
26. Россия. Законы и постановления. Полное собрание законов Российской империи. Собрание 2. Санкт Петербург: в Тип. 2 Отд-ния Собств. е. и. в. Канцелярии, 1830–1885. Т. 50, отд-ние 1: 1875.

**УДК 323.1(476)**

# УДЗЕЛ ЛКСМБ У ПРАВЯДЗЕННІ ПАЛІТЫКІ БЕЛАРУСІЗАЦЫІ

***А. У. Кімбар***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, andrejkimbar@gmail.com*

Артыкул прысвечаны вызначэнню дзеянняў, якія праводзіліся камсамолам Беларусі для ажыццяўлення палітыкі беларусізацыі, ацэнцы іх эфектыўнасці. У рабоце прыведзены прыклады стаўлення шараговых камсамольцаў да рэалізацыі палітыкі беларусізацыі. Прадстаўлена дынаміка